Женский подвиг в истории Беларуси. 1917–2017 годы [Электронный ресурс] : электронный сборник материалов Международной научно-практической конференции, 26 октября 2017 г., Витебск. – Режим доступа: http://vlib.by/index.php/ru/zhenskij-podvig

Лаўрык Т. А. *(г. Мінск)*

АХВЯРНАЕ ЖАНОЧАЕ КАХАННЕ Ў РАМАНЕ ЗІНАІДЫ ДУДЗЮК «СЛОДЫЧ І АТРУТА»

Зінаіда Дудзюк – паэтка, празаік, драматург, перакладчыца, лаўрэат абласных прэмій «Берасцейская зорка-1996» і «Пісьменнік года-2004». Таленавітая пісьменніца спрабавала сябе ў розных жанрах: такіх, як фантастыка, дэтэктывы, гістарычныя творы, дакументальныя нарысы, а праца ў тэатры падштурхнула яе да напісання драматычных твораў для дзяцей; паводле яе п’ес пастаўлены спектаклі.

Са шматлікіх твораў Зінаіны Дудзюк паўстае духоўнае аблічча сучаснай жанчыны – маці, грамадзянкі, якая трывожыцца за жыццё, будучыню. Па словах А. Бельскага, «З. Дудзюк не адчувае сябе па-за рэальным часам, яго праблемамі. У яе індывідуальнай манеры выказвання вельмі арганічная сацыяльная завостранасць пачуццяў» [1, с. 167].

Тэме кахання прысвечаны многія творы З. Дудзюк. І гэта пачуццё ў яе творах рознае. Гэта каханне Радуні і Веляслава з рамана «Велясіты», якім не было наканавана быць разам, але яны знайшлі магчымасць быць шчаслівымі. Марыля з рамана «Год 1812» пакахала рускага афіцэра Ляснеўскага, і каханне скончылася трагічна. Ці не ў каханні, магчымасці захаваць яго надоўга бачыць пісьменніца подзвіг звычайнай жанчыны?

Раман «Слодыч і атрута» (2013) – гісторыя пра каханне, жыццёвыя выпрабаванні і варункі лёсу, якія выпалі на долю гераіні. Успамінае пра сваё жыццё бабуля Зося, якая пражыла доўгае жыццё, памерла ў 96 гадоў. Перад смерцю яна расказала ўнучцы пра сваё няпростае жыццё і вялікае каханне, якое яна пранесла праз гады. Яе ўспаміны ляглі ў аснову рамана пра каханне. Аднак жанчына стала сапраўднай гераіняй: узрасціць у сабе каханне да чалавека, нягледзячы на ўсе яго недахопы, гэта вартае подзвігу. Зося змагла захаваць сваё пачуццё да чалавека, які, магчыма, і не адпавядаў яе марам пра сапраўднага мужчыну. Аднак яна на ўсё жыццё ўпэўнілася ў думцы, што Гардзей – адзінае яе

шчасце, толькі з ім яна зможа пражыць жыццё. Можа падацца, што ў гэтым рамане пісьменніца супярэчыць сваім поглядам на каханне, што адлюстраваны ў яе іншых творах: «Вялікае шчасце пакахаць выпадае, можа, раз у жыцці, ну, ад сілы – два ці тры. Астатнія мімалётныя захапленні існуюць толькі да першых расчараванняў. Чалавек, які па-сапраўднаму кахае, не можа дараваць іншай асобе ніякіх недахопаў і слабасцей. Тады ўсё імгненна развальваецца, быццам замак, пабудаваны на пяску... Бо каханне трэба карміць і даглядаць, як далікатную кветку, інакш яно завяне, засохне і памрэ... » [2, с. 48]. І гэта сапраўды так…

У рамане расповед ідзе пра жыццё дзвюх сясцёр, кожнай з якіх наканаваны розны лёс. «Калі старэйшая сястра хацела прадбачыць усё наперад, малодшая жыла адным імгненнем, загаралася шчасцем, як запалка, і згасала пры няўдачах, але новая радасць здатная была адрадзіць яе душу зноў» [3, с. 108].

Метафарычным увасабленнем сюжэту рамана з’яўляецца мастацкае рашэнне аправы выдання, якая змяшчае старыя фотаздымкі: Зося з Гардзеем (вясельны фотаздымак), са старэйшай сястрой Кацяй – вобразы жанчын, апранутых па модзе 20–30-х гг. Таксама тут размешчана фота з накладаннем абрысаў аднаго горада на другі: Брэст – заходнебеларускі горад (магчымая ідэнтыфікацыя) і Нью-Ёрк, дзе закончыла сваё жыццё Каця. Сумяшчэнне двух гарадоў адлюстроўвае лёс абедзвюх сясцёр. Багатае і нешчаслівае жыццё Каці, якая апынулася ў іншай краіне, куды адправілася шукаць лепшага жыцця. Яна спрабавала забыць Гардзея, якога таксама кахала. Старэйшая сястра імкнулася да дабрабыту, жыцця, не падобнага на тое, якім жыла на хутары – таму і едзе ў Амерыку. Здаецца, і стала багацейшай, чым на радзіме, але ці знайшла яна шчасце там? Памерла ў адзіноце, магчыма, атручаная...

І зусім непадобнае да жыцця Каці, поўнае выпрабаванняў, горычы, стратаў, але і крупінкі шчасця, якую яна атрымала ад каханага – у Зосі. «Зося не была прыгажуняю, але ў ёй палаў невынішчальны агонь жыцця, які і рабіў яе непадобнаю да іншых, асабліваю, прыцягальнаю» [3, с. 99]. Яна аддавалася свайму пачуццю да забыцця, дзеля кахання гатовая была на ўсялякую ахвяру. Жанчына проста існавала, але разумела, што яе асудзяць людзі, калі народзіць дзіця ад Гардзея без шлюбу, таму некалькі разоў перапыняла цяжарнасць. Аднак

Гардзей зноў і зноў прывязваў яе да сябе. Жанчына адчувала , што забыць яго не зможа, бо моцнае пачуццё трымала яе каля каханага. Зося добра разумела, што ён любіць толькі сябе і ніякай дапамогі ад яго чакаць не варта. Так было і з Марфай, якая зацяжарыла ад яго, давялося выйсці за іншага, каб ніхто не даведаўся пра цяжарнасць, аднак у вёсцы гэтага не схаваеш.

Пасля нараджэння сына Зося добра разумела, што б ні казалі родныя, нават без мужа яна будзе гадаваць сына – плён свайго кахання. Цяпер яна адчувала адказанасць за сына, якога нарадзіла і які з'яўляецца часткай яе. Жанчына ведала, што толькі ад вялікага кахання нараджаюцца прыгожыя дзеці. Такім быў для яе сын.

Шмат выпрабаванняў выпала на долю жанчыны. Перад вайной мужчына захварэў, апынуўся ў вар'яцкім доме, вярнуўся да жонкі ўжо зусім іншым. Пасля таго, як мужа арыштавалі за службу сельскім аграномам у час акупацыі, Зося разумее, што як жонка ворага, хутка таксама будзе арыштаваная. Але яна не адчувала за сабой ніякай віны, бо ў часе вайны жыла дзеля сваёй сям'і, расціла сына. У час акупацыі па нагавору Марфы магла быць арыштавана немцамі за дапамогу Гардзею, які ў даваенныя часы падтрымліваў КПЗБ. Зося пачынае рыхтавацца да арышту, і сапраўды праз некаторы час яе высылаюць на 20 гадоў разам з сынам у Казахстан на перасяленне. Было цяжка выжыць, многія людзі не вытрымлівалі клімату гэтай краіны. Хварэла і Зося, але доўгія дзесяць гадоў чакала вяртання мужа з месцаў зняволення. У Казахстане Зося падабалася доктару Селіванаву, у якога яна працавала. Ён прапанаваў жыць разам, стварыць сям'ю. Аднак яна ведала, што не зможа перастаць чакаць свайго мужа, якога можа ўжо і няма на свеце. Як сама казала Зося пра сваё каханне: «Жыла, каб толькі яму было добра, бо разумела, што чалавек хворы. Хто б на маім месцы згадзіўся на такое жыццё – ні жонка, ні ўдава? Мне знаходзіліся людзі, магла б жыццё ўладкаваць. А я яго чакала з усіх турмаў, з усіх дарог…» [3, с. 379].

Пасля смерці Сталіна пачаліся рэабілітацыі, Гардзею таксама важна было, каб яго рэабілітавалі, бо ён не адчуваў за сабой віны за працу ў час вайны. Пасля разгляду яго справы яго прызналі цяжка хворым шызафрэнікам, які ў час вайны не мог адказваць за свае дзеянні. Таму ў адносінах да Рахубы Г.М. быў спынены прысуд Ваеннага трыбунала і ўсе абвінавачванні зняты.

Зося ўсё жыццё памятала, што кахае Гардзея і будзе імкнуцца да таго, каб жыць з ім побач. І гэта былі шчырыя пачуцці, у якіх яна прызналася і сваёй сястры, калі трапіла да яе ў Амерыку. У сталым узросце жанчына адчувала, што не зможа супакоіцца, пакуль не замоліць свае грахі за вытручаных у маладосці ненароджаных дзетак. Таму рвалася ў Пячорскую лаўру. Ёй здавалася, што яе грахі перадаліся ўнучцы Ганулі, якая не магла ўладкаваць сваё жыццё. Дзяўчыну накіравалі працаваць пасля вучобы ў глухую палескую вёску, дзе не было моладзі.

Гаворачы пра ахвярнае каханне Зосі, трэба разгледзіць вобраз яе мужа Гардзея. Пісьменніца выкарыстоўвае гаваркое прозвішча, якое добра характарызуе героя: Гардзей Рахуба. У творы сама Зося тлумачыць яго прозвішча, гаворачы пра рахманасць героя, немагчымасць прывязаць яго. Раскрываючы вобраз Гардзея, пісьменніца ў першую чаргу перадае падзеі, якія адбываліся ў Заходняй Беларусі пасля 1939 года. Спробы прыстасавацца да жыцця пры любой уладзе добра характарызуюць не толькі героя, але самі палітычныя падзеі, якія адбываліся на Беларусі. Ён добра разумее, што пры новай ўладзе не стане лепш. Тое, на што спадзяваліся сяляне, чакаючы вызвалення ад польскага прыгнёту, не спраўдзілася. Гардзей у глыбіні душы жыў надзеяй, што тых, хто змагаўся за вызваленне краіны, будуць цаніць. Аднак да ўлады прыйшлі іншыя людзі – «васточнікі», якія займалі вядучыя кіруючыя пасады, бедната і непісьменныя сяляне. Гардзей да 1939 года пашыраў гаспадарку, хацеў лепшага жыцця сваёй сям'і, а цяпер зразумеў, што неабходна пазбавіцца лішняга. Ён прапануе цесцю тэрмінова пазбавіцца ад хатняй жывёлы, каб не залічылі ў кулакі. Аднак гэта не ўратавала бацьку Зосі, які быў высланы як кулак у Сібір і памёр у дарозе, нават не даехаўшы да месца.

Гардзей пачынае працаваць у горадзе памочнікам каморніка, але яго звальняюць з працы як палітычна ненадзейнага. Герой адчувае несправядлівасць новай улады, бо ў свой час сядзеў у польскай турме за тое, што ўзначальваў камсамольскую ячэйку. Таму з прыходам немцаў у час вайны ён пачынае працаваць сельскім аграномам, дапамагаючы новай уладзе. Гвалтам прымушае аднавяскоўцаў здаваць жывёлу і прадукты харчавання на карысць нямецкай

арміі. Пасля адыходу немцаў спрабаваў пазбегнуць кары, аднак быў арыштаваны і высланы на катаржныя працы.

Раман падзелены на дзве кнігі. У першай аўтарка расказвае пра падзеі да 1939 года, пра гісторыю адной заходнебеларускай сям'і, на долю якой выпалі шматлікія сацыяльныя катаклізмы: бежанства пасля пачатку I Сусветнай вайны, рэвалюцыя і грамадзянская вайна, польскі рэжым і прыход Саветаў. Адна з тэмаў твора – доўгі шлях Зосі да яе шчасця, калі яна пабралася з любым мужчынам. Яна адчувала поўнае шчасце. Зося зранку пачынала спяваць, «быццам у душы яе пасялілася вясёлая птушка» [3, с. 218].

У другой кнізе аўтарка распавядае пра II Сусветную вайну, нямецкую акупацыю, высылку ў Казахстан, хваробу Гардзея, падарожжа Зосі ў Амерыку. Таму і раздзелы ў кнігах маюць дакладныя і выразныя назвы, якія адлюстроўваюць пэўныя падзеі: «Радны гміны», «Прымак», «Ліхалецце», «Амерыканская спадчына» і інш.

Выкарыстоўвае пісьменніца ў кампазіцыі твора аўтарскія адступленні, якія арганічна ўліваюцца ў канву твора і садзейнічаюць выражэнню асноўнай ідэі твора. Аўтар сцвярджае філасофскія ісціны, якія падказваюць чалавеку, як жыць поўным жыццём: «Бо каханне – гэта толькі фантом, які нечакана з'яўляецца і гэтак жа нечакана знікае, пакідаючы гарачы след... Такое ж і чалавечае жыццё – з хваляваннямі, нягодамі і часовым спакоем. Напэўна, трэба прымаць усё, што яно прыносіць, не палохацца, не хавацца, не адгароджвацца ад яго, каб не шкадаваць пра няспраўджаныя спадзяванні, недасягнутыя мары, непадзеленае каханне» [3, с. 132–133]. Такім чынам пісьменніца ўзыходзіць да пераканання, што кахаць неабходна насуперак усім жыццёвым нягодам, а пераадоленне іх сведчыць пра глыбіню і сапраўднасць пачуцця.

Варта адзначыць лексічныя сродкі мовы, якія адлюстроўваюць галоўную тэму твора – каханне дзяўчыны. Тут пісьменніца выкарыстоўвае параўнанні пры апісанні прыроды: «…Толькі на захадзе неба яшчэ свяцілася чырванню, як шчака маладзенькай дзяўчыны, якую ўпершыню пацалаваў закаханы хлопец» [3, с. 107]. А ў канцы твора Зінаіда Дудзюк выкарыстоўвае яскравае ўвасабленне, параўноўваючы восень з маладзіцаю: «На горад насоўвалася восень, але была

яна яшчэ прывабная і шумлівая, як бойкая маладзіца на пачатку старасці, калі яшчэ сама не верыць, што аднойчы стане бяззубай, зморшчанаю, як кара старога дрэва» [3, с. 361]. Зося параўноўвае сябе з ліпай, якая па вясне абуджаецца і гоніць сок па ствале. Пісьменніца звяртаецца да фальклорных матываў, якімі багата апелюе ў сваіх творах: «Калі ж абуджуся і ажыву я? – пытаецца ў сябе Зося. – Ці так і засохну сухадрэвінаю, не зведаўшы ні цяпла, ні ласкі» [3, с. 316].

Трэба адзначыць і некаторыя элементы кампазіцыі твора, якія дапамагаюць вырашаць асноўныя задачы твора. У канцы твора аўтарка размясціла дзённікавыя запісы Гардзея, якія пісаліся ім напрыканцы жыцця. Яшчэ ў большай ступені яны даюць падставу сцвярджаць, што твор пісаўся пра рэальнага чалавека, прататыпам якога быў Гардзей. У эпілозе Зінаіда Дудзюк вызначае, што Гардзеева геалагічная гіпотэза пра хімічную прыроду каменнага вуглю, нафты і іншых выкапняў, якую ён зрабіў у сярэдзіне 50-х гг., была пацверджана ў 2006 г.

Раман Зінаіды Дудзюк «Слодыч і атрута» адлюстраваў вобраз звычайнай жанчыны, якая пражыла доўгае цяжкае жыццё, але стала гераіняй у сваёй сям'і. Яна праз усё жыццё пранесла светлае пачуццё да свайго мужа, падтрымала з яго цяжкім захворваннем. Прычым пісьменніца выразна адзначае, што рабіла яна гэта не проста ахвяруючы сабою, а адчуваючы каханне. Цяпер, у час росквіту фемінізму, такі подзвіг амаль нерэальны, часцей жанчыны працягваюць клапаціцца пра сваіх мужчын у сілу абавязку ці пачуцця адказнасці. Таму і ўражвае такое ахвярнае каханне гэтай жанчыны.

ЛІТАРАТУРА

1. **Бельскі, А.** Краса і смутак : дапаможнік для настаўнікаў / Алесь Бельскі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2000. – 236, [1] с.

2. **Дудзюк, З.** Закон захавання кахання / Зінаіда Дудзюк // Полымя. – 2014. – № 9. – С. 20–79.

3. **Дудзюк, З.** Слодыч і атрута : раман / Зінаіда Дудзюк. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. – 396, [2] с.

4. **«… І спее** слова дабрынёй»: творчы партрэт З. Дудзюк : зборнік / уклад. Н. М. Борсук. – Брэст : Лаўроў, 2001. – 183 с.